**Наталля Уладзіміраўна Прыступа (1959–2006), пісьменніца**



Наталля Уладзіміраўна Прыступа нарадзілася 12 красавіка 1959 года ў вёсцы Малоткавічы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Наталля з дзяцінства была інвалідам, не магла перасоўвацца самастойна, рухомымі былі толькі вочы і тры пальцы правай рукі. Сярэднюю адукацыю атрымала ў Рэчыцкай спецшколе-інтэрнаце, пасля чаго вярнулася дадому.

Цяжкае захворванне не зламала Наталлю Уладзіміраўну. Яна не замкнулася ў сабе: у паэзіі і ў жыцці ішла насустрач людзям. Хаця яна не атрымала ніякай гуманітарнай адукацыі, вершы яе настолькі прафесійныя, настолькі выразна і ярка выпісаны, метафарычныя, вобразныя, што думаецца – гэта работа майстра.

Першы яе верш быў апублікаваны ў 1980 годзе ў раённай газеце «Полесская правда». З таго часу яна друкавалася ў мясцовым і рэспубліканскім друку – «Полесская правда», «Пінскі веснік», «Заря», «Звязда», «Знамя юности», «Наша доля». Наталля Прыступа друкавала свае радкі ў альманахах «Дзень паэзіі», «Берасцейскія карані», «Берега Тавриды», «Встреча» (Барнаул), «Піншчына літаратурная», «На ладонях Припяти и Пины», у калектыўных зборніках «Память о крыльях», «Надежда», «Легких кружев волшебная стая», а таксама ў часопісах «Акно», «Нёман», «Першацвет», «Белые снегири» (Масква) і інш.

Наталля Прыступа – паэтэса рускамоўная, але ў часопісе «Першацвет» (1994. № 3) былі надрукаваны яе вершы на беларускай мове.

Першы зборнік Н. Прыступы з сімвалічнай назвай «Попытка» быў выдадзены тыражом 500 экзэмпляраў напрыканцы 1996 года пры садзейнічанні рэспубліканскага цэнтра дасуга інвалідаў «Інвацэнтр». Спроба аказалася ўдалай, і з інтэрваламі ў год-два ў розных выдавецтвах Брэстчыны выходзяць яшчэ шэсць кніг: «Кленовые листья» (1997), «Быль» (1998, у сааўтарстве з Е. Палеес), «С любовью» (1999), «Белый взмах» (2001, у сааўтарстве з А. Мірчук), «Два крыла» (2004), «В объятиях судьбы» (2006, у сааўтарстве з В. Казакевічам).

У 2005 годзе яна была прынята ў Саюз беларускіх пісьменнікаў. Але ў наступным годзе яна ў шэрагу вядомых паэтаў, празаікаў, крытыкаў па ўласнаму жаданню напісала заяву аб выхадзе з Саюза беларускіх пісьменнікаў і ўступленні ў грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі».

Наталля Уладзіміраўна з'яўлялася кансультантам літаратурнай студыі «Інвацэнтр», шмат пісала і друкавалася сама. Была літкансультантам у газеце «Пінскі веснік», вяла вялізную грамадскую работу з людзьмі, паэтамі, была ў курсе ўсіх падзей сучаснасці.

Наталля Прыступа – прыкметная з'ява ў сучаснай брэсцкай паэзіі, яна паэтка з выразным індывідуальна-аўтарскім стылем. Даследчык майстроў

слова Піншчыны Валянціна Локун лічыць, што паэзія Н. Прыступы «балансуе на мяжы рэалізму і мадэрнізму, лірыкі і “інтэлектуалізму”. Яе радкі метафарычныя і асацыятыўныя».

Наталля Уладзіміраўна Прыступа памерла 8 жніўня 2006 года.

«Творчасць паэтэсы, – адзначае В. Локун, – як і яе жыццё, успыхнула нечакана ярка і непаўторна, каб у самым росквіце нечакана абарвацца». Яе творы – гэта яна сама. І яе імя застанецца ў сэрцах удзячных чытачоў.

**Творы Н. У. Прыступы**


1. **Попытка** : стихи / Наталья Приступа ; худож. Н. Васейкина. Минск : РЦДИ «Инвацентр»,1996. 92 с. : ил.
2. **Кленовые** строфы : стихи / Наталья Приступа. Брест : Управление по печати облисполкома, 1997. 108 с.
3. **Лики** любви : стихи / Наталья Приступа ; авт. вступ. статьи Валентина Локун // Полеес, Е. Д. Быль : стихи / Наталья Приступа, Елизавета Полеес. Минск : ЛИП «Полет души», 1998. С. 51–139.
4. **С любовью** : стихи / Наталья Приступа ; худож. Э. Г. Величко. Пинск : Редакция газеты «Пінскі веснік», 2000. 208 с.
5. **Всё** для любви : стихи / Наталья Приступа ; авт. вступ. ст. Валерий Гришковец // Приступа, Н. Белый взмах : стихи / Наталья Приступа, Елена Мирчук. Пинск : КУИП «Редакция газеты “Пінскі веснік”», 2001. С. 3–64.
6. **Мелодии** Вселенной : стихи, рассказы / Наталья Приступа ; авт. вступ. ст. Валентина Локун // Козакевич, В. В. Два крыла : стихи, рассказы / Козакевич Валерий Владимирович, Приступа Наталья Владимировна. Пинск : КУП «Пинская региональная типография», 2004. С. 119–249.
7. **В кудрявых** снегопадах : стихи, рассказы / Наталья Приступа ; авт. вступ. ст. Валерий Гришковец // Козакевич, В. В. В объятиях судьбы : поэзия, проза / Козакевич Валерий Владимирович, Приступа Наталья Владимировна. Пинск : КУП «Пинская региональная типография», 2006. С. 159–297.
8. **«Темы** прежние – не важные…» ; «Тревожно сердцу. Звуки стынут…» : стихи / Наталья Приступа // Пінскі веснік. 2005. 2 верас.
9. **В память** о детском доме : [стихи] / Наталья Приступа // Берасцейскія карані: гісторыка-краязн. і літ. зборнік. Брэст, 1993. С. 207.
10. **Попутно** ; «Невстреченный рассвет…» ; «На счастье или на беду…» : [стихи] / Наталья Приступа // Нёман. 1994. № 5. С. 92–93. (Впервые в “Нёмане”).
11. **Триптих** о простом и вечном : [стихи] / Наталья Приступа // Надежда : лит.-худож., информ.-публицист. вестник. Минск : Беларусь, 1994. № 4 (20). С. 10–12.
12. **Стихотворения** / Наталья Приступа // Піншчына літаратурная : літ.-маст. зб. / рэдкал. М. І. Ляшук (гал. рэд.) [і інш.] : прадм. В. І. Локун ;

уступ. арт. І. Д. Чараўко. Пінск : Рэдакцыя газеты «Пінскі веснік»,1999. С. 52–53.
13. **Колодцы** ; Тревога ; Память : [стихи] / Наталья Приступа // Нёман. 2000. № 10. С. 193–194. (Из поэтических тетрадей).
14. **«Пусть** останусь опять одна…» ; «…Краше, чем разнообразнее…» : стихи / Наталья Приступа // Живая вода. 2003. 24 мая.
15. **«Скоро** разлукой, как лентой, повязаны будем…» : стихи / Наталья Приступа // Полесская правда (Пинск). 2004. 20 марта.
16. **Проводы** ; Предвкушение : стихи / Наталья Приступа // Наша доля. 2004. 30 студз.
17. **Стихи** / Наталья Приступа // На ладонях Припяти и Пины : литературный альманах Пинщины / [авт.-сост. Кибак Иван Алексеевич]. Минск : ОДО «Тонпик», 2004. С. 76–82.
18. **За счет** иных… : стихи / Наталья Приступа // Полесская правда (Пинск). 2005. 25 янв.
19. **Стихи** / Наталья Приступа // Нёман. 2005. № 9. С. 166–167.
20. **Хотя бы** так… : стихи / Наталья Приступа // Заря. 2005. 28 июня.
21. **В ожидании** ; Приглашаю : стихи / Наталья Приступа // Заря. 2006. 28 янв.
22. **Истоки** : стихи / Наталья Приступа // Западная Двина. 2006. № 2 (9). С. 8–11.
23. **На высокой** волне : [последний материал поэтессы, посвящ. творчеству В. Козакевича] / Наталья Приступа // Пінскі веснік. 2006. 11 жн.
24. **Провожаю** затем, чтобы ждать : стихи / Наталья Приступа // Нёман. 2007. № 8. С. 114–116.
25. **Послание** к В. ; Дай бог : стихи / Наталья Приступа // Знамя юности. 2009. 6 нояб.

## Аб жыцці і творчасці Н. У. Прыступы

1. **Наталля Прыступа** // Літаратурная карта Берасцейшчыны / рэд. і уклад. А. Крэйдзіч. Брэст : ААТ «Брэсцкая друкарня», 2008. С. 494–495.
2. **Нестеренко, Б.** Книжное обозрение : [о книге Валерия Козакевича и Натальи Приступы “В объятиях судьбы”] / Борис Нестеренко // Нёман. 2008. № 10. С. 185–186.
3. **Приступа** Наталья Владимировна : Биография. Библиография. Творчество // Антология Беллитсоюз «Полоцкая ветвь»: 1994–2009 гг. Минск, 2010. С. 354–359.
4. **Приступа** Наталья Владимировна : [памяти товарища] / Брест. обл. отделение Союза писателей Беларуси // Пінскі веснік. 2006. 11 жн.
5. **Сытин, Ф.** Презентация с привкусом горечи : [презентация книги Н. Приступы «В объятиях судьбы» (издана в соавторстве с В. Козакевичем), которая вышла после смерти поэтессы] / Фёдор Сытин // Пінскі веснік. 2006. 4 ліст.
6. **Ляшук, М.** В Союзе – пятая. Наталья : [поэтесса Н. Приступа принята в Союз белорусских писателей] / Мария Ляшук // Пінскі веснік. 2005. 26

лют.
7. **Пададзены** заявы аб выхадзе з СБП : [па ўласнаму жаданню Н. Прыступа напісала заяву аб выхадзе з СБП і ўступленні ў ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі»] // ЛіМ. 2006. 10 сакав.
8. **Гришковец, В.** В душе – горная река… : [о поэзии Н. Приступы] / Валерий Гришковец // Полесская правда (Пинск). 2005. 5 марта
9. **Локун, В.** На грани отчаяния и надежды : [о поэзии Н. Приступы] / Валентина Локун // Пінскі веснік. 2005. 20 ліп.
10. **Мирчук, А.** Объединяют «Два крыла» : [лит. встреча студентов Пинского филиала БГЭУ с Натальей Приступой] / Алёна Мирчук // Пінскі веснік. 2004. 17 снеж.
11. **“С любовью** и благодарностью” : с поэтессой Натальей Приступой встретилась Галина Дивель // Акно. 2001. № 3–4. С. 114–115.
12. **Ляшук, М.** Щедрой души светлые порывы… : [о матери поэтессы Александре Григорьевне Приступа] / Мария Ляшук // Пінскі веснік. 2001. 12 кастр.
13. **Ляшук, М.** “Белому взмаху” – высокого неба : [сборник стихов Н. Приступы и Е. Мирчук “Белый взмах”] / Мария Ляшук // Пінскі веснік. 2001. 23 ліст.
14. **Гришковец, В.** Смотреть на мир с любовью : [сборник стихов Н. Приступы “С любовью”] / Валерий Гришковец // Полесская правда (Пинск). 2000. 12 апр.
15. **Демид, И.** Себя суметь преодолеть : [презентация сборника стихов Н. Приступы “С любовью”] / Инна Демид // Варяг пресс (Пинск). 2000. 26 мая.
16. **Гришковец, В.** Только очень хотелось в небо… : [о поэзии Н. Приступы] / Валерий Гришковец // Белорусская нива. 2000. 28 июня.
17. **Наталья** Приступа // http://www.stihi.ru/2012/07/02/62